У мастацкай галерэі **“Універсітэт культуры”** працуе персанальная выстава маладога жывапісца члена Беларускага саюза мастакоў Васіля Зянько “REFLEXUS”. Мастак эксперыментуе са здольнасцю чалавека пры дапамозе органаў пачуццяў успрымаць прадметы навакольнага свету. В.Зянько акцэнтуе ўвагу на тым, як канкрэтны матэрыяльны аб’ект у выглядзе сукупнасці вобразаў і паняццяў адлюстроўваецца ў чалавечай свядомасці, адсюль і назва “REFLEXUS” — “Адлюстраванне”. У экспазіцыі прадстаўлены чатыры рознахарактарныя аб’екты жывой матэрыі, якія маюць свае асаблівыя прыкметы і ўласцівасці. У кожным з чатырох блокаў пададзены непасрэдная выява аб’екта, яго найбольш яскравы фрагмент, структура (напаўненне), фактура і апошняе звяно — твор, што выяўляе непасрэдную сутнасць аб’екта. Усе прадстаўленыя ў праекце “REFLEXUS” творы выкананы В.Зянько ва ўнікальнай аўтарскай тэхніцы, якая спалучае ў сабе работу акрылавымі фарбамі па палатне і складаную рэльефную падкладку.